

# Палаючы абярэг



**Грамнічная свечка спалучыла ў сабе сімволіку дзвюх гісторыка-культурных традыцый. З аднаго боку, яна ахоўвала чалавека, яго сям'ю, гаспадарку ад негатыўнага ўздзеяння злых сіл, прыродных катаклізмаў, а з другога — служыла надзейнай перасцярогай у той час, калі трэба было вырашаць адказныя жыццёвыя пытанні, а таксама пры неабходнасці пакідаць адухоўленую, асвоеную прастору свайго жытла і адпраўляцца ў далёкую дарогу. Святло абрадавай свечкі ачышчала перадзе чалавека шлях, нейтралізоўвала перашкоды, была той пуцяводнай зоркай, ніткай вядунні Арыядны, якая дапамагала пераадолець лабірынты жыцця, казачным клубком нітак, які давала славянская Баба Яга (той жа захавальнік родавых традыцый), поясам-спавівачом, без якога ні адзін чалавек не пакідаў хату, Віфлеемскай зоркай, што ўказвала чалавеку не толькі сцежкі-дарожкі сённяшняга дня, але і на ўсім жыццёвым шляху.**

### Як простую свечку грамнічнай зрабіць

Звычайна свечкі-"грамніцы" людзі рыхтавалі загадзя. Тыя, хто трымаў пчол, выплаўлялі самыя вялікія свечкі, у каго пчол не было — куплялі жоўты воск у краме або знаёмых пчаляроў. Беларускі этнограф М.Я. Нікіфароўскі адзначаў, што грамнічныя свечкі былі "такога памеру, які дазваляў бы схаваць яе на грудзях пад вопраткай або ў рукаве і такім чынам утаіць ад чужых прысутнасць свечкі". Ён жа адзначаў, што свечка, памеры якой карацей за пяць вяршкоў (22 см) і таўшчынёй менш за мезены палец, не лічылася "грамніцай" і не магла надзейна засцерагчы яе ўладальнікаў. Найбольш тыповыя памеры былі наступныя: даўжыня павінна быць прыкладна 10 вяршкоў (44 см), а таўшчыня — тры чвэрці вяршка (каля 3,5 см). Такія памеры былі абумоўлены практыкай гаспадарчай дзейнасці і той колькасцю абрадавых сітуацый, у якіх грамнічная свечка выступала ключавым атрыбутам.

Далей этнограф заўважае: "Яны захоўваліся ў розных месцах: у сенцах, у клеці, у свірне, як простыя прадметы штодзённага ўжытку. У гэтым выпадку дазвалялася ўжываць падрыхтаваную свечку пры гасцявых, напрыклад, патрэбах, пры вячэрніх работах, але такая свечка ўжо не ўжывалася потым на грамнічныя патрэбы, а спальвалася пры будзённым ужыванні або, пераплаўленая, паступала на падрыхтаванне новай свечкі, дарылася беднаму, адносілася ў царкву, у капліцу".

РЭПАЗІТОРЫЙ БДПУ

М.Я. Нікіфароўскі не толькі апісаў працэс прыгатавання незвычайных свечак, але паведаміў асноўныя этапы пераўтварэння звычайнай свечкі ў абрадава-засцерагальную. Ён прывёў апісанне ў адпаведнасці з канонам уніяцкага трэбніка. “Благаславенне на Грамніцы Гасподне” адбывалася “над укладзенымі на століку, табурэтках або на ўнесенай у царкву лаўцы свечкамі, чыталася пяць спецыяльна прымеркаваных малітваў, тварылася трохразовае кадзенне іх, акрапленне свянцонай вадой і трохразовае асвячэнне іх напрастольным крыжам, з якім свяшчэннік выходзіў з алтара для трэбаспраўлення”. Пасля гэтага свяшчэннік уласнаручна вяртаў гаспадарам іх свечкі, багамольцы запальвалі іх пад гучны вокліч святара: “Благаславенна царква”. Тушылі свечкі пераварочваннем кнота ўніз і хавалі за пазуху.

Сёння хіба толькі пчаляры здольныя зрабіць сапраўдную свечку-грамніцу адпаведных памераў. Часцей за ўсё свечкі купляюць у храмах, аднак у сувязі з тым, што яны значна меншых памераў, раяць браць тры штукі і перавязваць “васьмёркай” пасмачкай вычасанага лёну.

## Трымай “грамніцу” ад чужых вачэй!

З моманту асвячэння (заканчэння спецыяльнага абрадавага дзеяння, усходам Сонца) у храме або правядзення адпаведнага рытуалу дома той ці іншы святочны атрыбут ператвараўся ў сакральную рэч, якая, з аднаго боку, магла па-рознаму спрыяць чалавеку, сям’і, гаспадарцы, а з другога — станавілася аб’ектам празмерных дамаганняў людзей, звязаных з чорнай магіяй. Напрыклад, перавяслы, якімі звязалі рукі і ногі нябожчыку, спрыялі лячэнню захворванняў суставаў тых жа рук і ног. Аднак іх магічнае выкарыстанне ў начны час магло прывесці да розных бедаў у сям’і памерлага. Якраз таму знаўцы тайных ведаў раілі: сямейны абярэг таксама трэба сцерагчы, каб ён не патрапіў у чужыя рукі. Да ліку сакральных атрыбутаў адносілася і грамнічная свечка. На працягу года яе захоўвалі ў чырвоным куце за абразамі або ў куфэрку, у якім з правага боку была спецыяльная палічка або збітая з дзвюх дошак скрынка, дзе захоўваліся нажніцы, катушкі нітак, напарстак, паперы (дакументы), бабуліны пацеркі і іншыя сямейныя рэліквіі. Існавала павер’е: каб злыя духі не ўкралі гаючую і засцерагальную моц “грамніцы”, яе трэба было трымаць падалей ад чужых вачэй, каб ніхто не ведаў, дзе яна схавана, і нават не здагадваўся, што яна ёсць у хаце.



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА

Акрамя таго, старыя людзі раілі: “Грамнічная свечка не падлягае пазычанню, як і агонь, нават у блізкія дамы сваякоў, родным асобам, што жывуць у іншай сям’і”.

Пераканаўчым сведчаннем гэтаму з’яўляецца і тое, з якой павагай людзі ставіліся не толькі да саміх свечак, але і да іх аплаўленых рэштак, што ўтвараліся ў выніку няўмелай апрацоўкі воску, непрапарцыянальнасці таўшчыні свечкі і яе кноту, пры не дакладна вертыкальным утрыманні яе падчас выканання розных абрадавых дзеянняў.

Невялічкія кавалачкі свечачнага сплаву ўтыкаліся ў хлеб і даваліся як выключны эфектыўны народны сродак пры лячэнні сурокаў у чалавека і жывёлы. Выкарыстоўваліся яны і ў тым выпадку, калі карова пачынала даіцца крывёю.

## Рытуальныя дзеянні ў дзень святкавання Грамніц

Неабходна адзначыць, што “грамніца” была ўніверсальнай абрадавай рэччу, яна выконвала ролю абярэга, амулета і нават талісмана.

● Пасля вяртання дадому гаспадар неадкладна даставаў свечку, жонка запальвала яе і адбываўся незвычайны, але абавязковы абрад агністага крыжавання. Спачатку бацька абпальваў крыжападобна валасы на сваёй галаве, потым жонцы і ўсім астатнім членам сям’і па ўзросце. Па чарзе да яго падыходзілі ўсе члены сям’і і судакраналіся з полымем, тым самым быццам бы далучаючыся да жыццядайнага нябеснага агню, які знішчае ў чалавеку ўсю брыдоту. Абрад хатняга вогненнага крыжавання нагадваў тое, што адбываецца штогод у Іерусаліме, у храме, які ўзведзены каля



РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Гроба Гасподняга, на Вялікдзень. Агонь, які ўспыхвае як благаславенне на новы цыкл жыцця, у бліжэйшыя 10-15 хвілін не прыносіць боль, таму людзі смела трымаюць яго ў руках, перадаючы эстафету святасці адно аднаму.

● Пасля "вогненнага асвячэння" ўсіх дамачадцаў бацька ў суправаджэнні дзяцей абходзіў усе куты хаты, зноў-такі крыжападобна выпальваючы нячыстую сілу. Знакам такога "выпальвання" заставаліся чорныя крыжы на бэльках або дзвярах.

● Затым ён выходзіў у двор і выконваў той жа самы абрад ва ўсіх гаспадарчых пабудовах, за выключэннем лазні.

● Акрамя гэтага, у некаторых рэгіёнах у хлеў неслі грамнічную свечку і разламвалі-разразалі яе на столькі частак, колькі жывёл там было. Такое дзеянне надзейна захоўвала свойскую жывёлу ад сурокаў.

Дбайныя гаспадыні не абміналі такое вялікае свята для выканання асобных рытуальна-магічных дзеянняў, скіраваных на паляпшэнне дабрабыту і перасцярогу дамачадцаў:

● Курам давалі больш аўса, каб яны лепш несліся, а яйкі былі больш смачнымі. Прыказка сведчыла: "Кармі курэй аўсом — вясной і летам будзеш з яйцом".

● Вярнуўшыся дадому пасля вячэрняга набажэнства, гаспадар трос садовыя дрэвы, каб яны далі багаты ўраджай пладоў.

● Традыцыя забараняла ў гэты дзень адпраўляцца ў далёкую дарогу. Напрошваецца прамая аналогія з Калядамі, калі ў першы вечар пажадана было ўсім сядзець за сямейным сталом. Праз кароткі прамежак часу пачнецца Вялікі пост, таму лічылася абавязковым сем раз паесці ў гэты дзень.

● У дзень Грамніц у храмах асвячалі не толькі свечкі, але і ваду. Па ступені значнасці грамнічная вада лічылася на адным узроўні з той, якую бралі на Вадохрышча. Ваду даволі часта выкарыстоўвалі адначасова са свечкай. Калі хлопец ішоў служыць у войска, то маці з бацькам акраплялі яго на выхадзе з хаты свянцонай вадой і ўголас гаварылі наступныя словы: "Божухна, беражы цябе".

● Аднак найбольш моцным абярэгам грамнічную свечку лічылі падчас летняй навальніцы. Тое, што нарадзілася ад нябеснага агню, тое, што асвечана царкоўным абрадам, станавілася своеасаблівым гарантам перасцярогі. Свечка-грамніца, як дачка бога-грамаўніка, павінна была адвесці гнеў бацькі і заступіцца за чалавека ўжо хаця б таму, што ў гэтай хаце прысутнічала яго сімвалічная частка.

Улетку як толькі гаспадыня пачуе набліжэнне навальніцы, яна запальвала "грамніцу" і ставіла на падаконнік. Бог-грамаўнік ляскатаў на ўсё навакольле, паласаваў неба слядамі сваёй калясніцы, быццам вышукваў тых, хто не паважаў законаў продкаў, каб пакараць іх за гэта. Матыў пошуку і пакарання даволі шырока прадстаўлены ў беларускім фальклоры і міфалагічных уяўленнях. Так, багіня-ахоўніца ткачых і самога ткацтва Мокаш, а пазней Параскева Пятніца хадзілі па вёсках і выглядалі праз вокны тых гаспадынь, якія парушалі забарону ткаць і прасці ў пятніцу, "каб кастрыцай продкам вочы не зацерушыць". Працяглая засуха пашкодзіць ураджай у тых мясцінах, дзе парушылі залатое правіла народнай культуры не гарадзіць плот да Радаўніцы, таму што перад тым, як наводзіць парадак на сваім прысядзібным участку, трэба было пайсці і навесці парадак на магілах сваіх продкаў. Беларускія легенды сцвярджалі нават, што тыя храмы, у якіх парушалі хрысціянскія традыцыі, разам з людзьмі праваліваліся пад зямлю і на іх месцы ўтвараліся азёры.

**Аксана КАТОВІЧ**



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА

РЭПАЗІТОРЫЙ БДПУ